| перед покупателями и заказчиками | 622 | 26 | 11 |
| по оплате труда | 623 | 361 | 416 |
| по расчетам с персоналом | 624 | - | |
| по налогам и сборам | 625 | 674 | 477 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 100 | 44 |
| по лизинговым платежам | 627 | | |
| прочая кредиторская задолженность | 628 | 208 | 59 |
| Задолженность перед учредителями | 630 | 2 | 99 |
| В том числе: | | | |
| по выплате кредитов, дивидендов | 631 | 2 | 99 |
| прочая | 632 | - | |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | - | |
| Прочие виды обязательств | 650 | - | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **690** | **7323** | **6783** |
| **БАЛАНС** | **700** | **12940** | **13650** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 111569 | 96004 |
| Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 15729 | 13873 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020) | 020 | 95840 | 82131 |
| Из строки 010 сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 77787 | 67737 |
| Валовая прибыль | 040 | 18053 | 14394 |
| Расходы на реализацию и управленческие расходы | 060 | 16169 | 13719 |
| Прибыль (убыток) от реализации (020-030-060) | 070 | 1884 | 675 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 350 | 850 |
| Налоги, включаемые в операционные доходы | 081 | 55 | 165 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 090 | 295 | 685 |
| В том числе: | | | |
| От сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование | 091 | | - |
| От выбытия основных средств и нематериальных активов | 093 | 192 | 1 |
| Прочие операционные доходы | 099 | 103 | 684 |
| Операционные расходы | 100 | 198 | 73 |
| В том числе: | | | |
| Расходы от операций с активами | 102 | 193 | 28 |
| Прочие операционные расходы | 109 | 5 | 45 |
| **Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (090-100)** | **120** | **97** | **612** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 129 | 317 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | | - |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) | 140 | 129 | 317 |
| В том числе: | | | |
| Внереализационные расходы | 150 | 492 | 343 |
| **Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **-363** | **-26** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160)** | **200** | **1618** | **1261** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 553 | 403 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | | - |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (+/-200+210-220) | 240 | 2171 | 1664 |
| Налог на прибыль | 250 | 501 | 376 |
| Прочие налоги и сборы из прибыли | 260 | 144 | 137 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 3 | 2 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270) | 300 | 970 | 746 |
| Справочно (из строки 240) Сумма льготы по налогу на прибыль | | | |
| Прибыль на 1 акцию (руб.) | 320 | 17388 | 13327 |

| | |
|---|---|
| **Данные отчетности подтверждены** (наименование и номер лицензии аудиторской организации или наименование контролирующего органа, проводившего проверку) | ООО «Аудит Инком» лицензия № 02200/0495649 от 18.02.2009, решение № 505 от 26.04.2001 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **К-во акционеров** | **Всего** | **289** | **Юридических лиц** | **1** | **Физических лиц** | **288** |

**Информация о дивидендах и акциях**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| ***Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде*** | *Миллионов рублей* | **97** | **-** |
| ***Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)*** | *Рублей* | **777** | **-** |
| ***Обеспеченность акции имуществом Общества*** | *Тысяч рублей* | **55** | **45** |
| ***Количество простых акций, находящихся на балансе Общества*** | *Штук* | **-** | **-** |
| **Информация о задолженности** | | | |
| ***Просроченная дебиторская задолженность*** | *Миллионов рублей* | **-** | **-** |
| ***Просроченная кредиторская задолженность*** | *Миллионов рублей* | **-** | **-** |
| **Среднесписочная численность работающих (человек)** | | **754** | |
| **Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг** | **розничная торговля продуктами питания, напитками и табачными изделиями** | | |

**Генеральный директор** **С.А. Смольский**

**Главный бухгалтер** **С.Г. Бурая**

**ОАО «Постторг» сообщает, что выплата дивидендов за 2009 год на акции акционеров будет производиться с 20 по 22 апреля 2010 года в кассе ОАО «Постторг» по адресу: г. Минск, ул. Клумова, 3.**

УНП 100036531.

**Администрация.**

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

1 красавіка 2010 г.
№ 13 (207)


## БОЛЬШ ПАСЛУГ І НОВЫХ АБ'ЕКТАЎ

**Сёння бытавое абслугоўванне ў краіне вядуць больш за 11 тысяч атэлье, цэхаў і майстэрняў, што належаць юрыдычным асобам, дзе занятыя каля 64 тысяч работнікаў, і звыш 50 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў.**

Паводле інфармацыі Міністэрства гандлю, летась аб'ём рэалізацыі бытавых паслуг, аказаных насельніцтву праз усе каналы рэалізацыі, склаў 1985,7 мільярда рублёў. Тэмп росту да ўзроўню 2008 года ў супастаўных цэнах — 116,4 працэнта пры заданні 113—114 працэнтаў. Чысты прыбытак арганізацый бытавога абслугоўвання — 8,59 мільярда рублёў і ў параўнанні з 2008 годам павялічыўся ў 1,5 раза.

За мінулы год было распрацавана і знайшло ўкараненне на вытворчасці больш за 3 тысячы новых узораў і мадэляў мэблі, абутку, галаўных убораў, швейных, трыкатажных, ювелірных вырабаў, новых мадэляў прычосак, вырабаў рытуальнай атрыбутыкі. За гэты ж перыяд 64 раённыя камбінаты бытавога абслугоўвання насельніцтва пашырылі аказанне 42 дадатковых відаў паслуг жыхарам вёскі з улікам мясцовых умоў, было адчынена 749 новых аб'ектаў бытавога абслугоўвання насельніцтва, падрыхтаваны 263 чалавекі па рабочых спецыяльнасцях для працы ў комплексных прыёмных пунктах і арганізацыях бытавога абслугоўвання насельніцтва.

У рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады толькі за мінулы год быў праведзены рамонт 289 сельскіх комплексных прыёмных пунктаў і аб'ектаў бытавога абслугоўвання, у тым ліку ў аграгарадках — 173. Былі адчынены 83 новыя комплексныя прыёмныя пункты, у тым ліку ў аграгарадках — 78.

У 2010 годзе, як плануюць у Міністэрстве гандлю, паказчык па аб'ёмах рэалізацыі бытавых паслуг насельніцтву будзе на ўзроўні не меней за 117—118 працэнтаў да леташняга. Пры гэтым колькасць аб'ёктаў бытавога абслугоўвання павялічыцца не менш чым на 200 новых адзінак. У рамках Дзяржпраграмы плануецца таксама правесці рамонт 197 сельскіх комплексных прыёмных пунктаў і аб'ектаў бытавога абслугоўвання, з якіх 176 — у аграгарадках.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# АДТОК КАДРАЎ

## Асноўная «місія» медыцынскай сястры — афармленне справаздачнасці?

### Сярэдняя працягласць працоўнага дня ва ўчастковай медсястры дасягае 9-9,5 гадзіны

**Усяго пяць гадоў таму кіраўніцтва галоўнага медыцынскага ведамства было заклапочана праблемамі з працаўладкаваннем выпускнікоў сярэдніх медыцынскіх устаноў адукацыі. Калі пры размеркаванні выпускнікоў медыцынскіх ВНУ апошнія ішлі літаральна нарасхват, то пры размеркаванні кадраў з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй назіраўся зусім іншы малюнак: заявак ад арганізацый аховы здароўя было значна менш, чым падрыхтаваных маладых спецыялістаў.**

Прайшло ўсяго некалькі гадоў і сітуацыя змянілася з дакладнасцю наадварот: цяпер міністэрства хвалявала ўжо не перавытворчасць, а дэфіцыт сярэдняга медперсаналу. Летась, напрыклад, выпуск спецыялістаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй дазволіў задаволіць заяўкі працадаўцаў толькі на 50 працэнтаў. Пры гэтым, як гэта ні парадаксальна, найбольшая патрэба ў медыцынскіх сёстрах сёння ў Мінску і ў рэспубліканскіх установах аховы здароўя. Таму сёлета плануецца павялічыць набор у сярэднія спецыяльныя медыцынскія ўстановы на 20 працэнтаў.

— Як мне падаецца, кадры з сястрынскай адукацыяй выкарыстоўваюцца недастаткова эфектыўна, і ўплыў гэтых спецыялістаў на палітыку лячэбных устаноў вельмі абмежаваны, — падзяліўся сваімі меркаваннямі з калегамі на рэспубліканскім кангрэсе «Дасягненні медыцыны» **галоўны ўрач 34-й цэнтральнай раённай паліклінікі горада Мінска Дзмітрый ШАЎЦОЎ**. — Нагрузкі на сярэдні медперсанал пастаянна растуць, як расце і незадаволенасць медсёстраў сваім сацыяльным становішчам, умовамі арганізацыі іх працы і маральная незадаволенасць ад работы... Таму нядзіўна, што сёння мы назіраем адток кваліфікаваных сястрынскіх кадраў з сістэмы аховы здароўя.

Напрыклад, у Савецкім раёне сталіцы ўкамплектаванасць сярэднім медыцынскім персаналам ва ўстановах першаснага звяна складае 77,7 працэнта па фізічных асобах, а па занятых пасадах яна дасягае 91,3 працэнта. Каэфіцыент сумяшчальніцтва складае 1,25 стаўкі. А колькасць пенсіянераў сярод працуючых дасягае 20 працэнтаў.

— Аналіз работы ўчастковай медыцынскай сястры цэнтральнай раённай паліклінікі паказаў, што працягласць яе працоўнага дня складае ў сярэднім 9—9,5 гадзіны пры нармаваным працоўным дні ў сярэднім 7 гадзін 30 хвілін, — паведаміў Дзмітрый Шаўцоў. — З іх 5 гадзін прыпадаюць на работу непасрэдна на прыёме з участковым тэрапеўтам (55 працэнтаў працоўнага часу). За гэты час медыцынскай сястры даводзіцца запаўняць ведамасці ўліку наведванняў, працаваць з амбулаторнымі картамі (падклейваць аналізы, дыягнастычныя даследаванні), выпісваць пацыентам накіраванні на аналізы ЭКГ, флюараграфію, запаўняць бланкі рэцэптаў, лісткі непрацаздольнасці, уносіць нумары льготных рэцэптаў у амбулаторную карту і карту ўліку льготнага водпуску лекавых сродкаў. Пры неабходнасці правядзення кансіліуму — афармляць патрэбную дакументацыю. Таксама ў абавязкі ўчастковай медыцынскай сястры ўваходзіць выпіска накіраванняў на шпіталізацыю, кансультацыі, тлумачэнне пацыентам магчымага часу і месца здачы аналізаў, правільнасці падрыхтоўкі да даследаванняў, суправаджэнне пацыента ў працэдурны кабінет або да іншых спецыялістаў.

Работа на ўчастку займае ў сярэднім 3 гадзіны 10 хвілін, або 34,4 працэнта працоўнага часу. На кожную медыцынскую сястру прыпадае выкананне не менш як 5-6 урачэбных прызначэнняў, на якія трэба выдаткаваць 2,5-3 гадзіны. Таксама трэба ўлічваць, што ўчастковая медыцынская сястра штодня выконвае не менш як 2 патранажы (а гэта яшчэ сама меней 40 хвілін) і не менш як 2 актывы, якія перадаюцца ў паліклініку службай хуткай дапамогі для наведвання людзей, якія выклікалі «хуткую дапамогу» напярэдадні. Паколькі на даму наведваюцца пераважна немаладыя і адзінокія пацыенты, якім патрабуецца не толькі вымярэнне артэрыяльнага ціску і кансультацыі па прыёме медыкаментаў, але і выкананне чыста сацыяльных функцый, то рэальна такія візіты займаюць часу нашмат больш. **Выходзіць, што ў адведзеныя ёй 2,5-3 гадзіны медыцынская сястра павінна якасна выканаць 9-10 візітаў, для якіх павінна быць адведзена ў сярэднім 4,5-5 гадзін (па 30 хвілін на адзін візіт).** Хоць для сярэдняга медыцынскага персаналу нормаў нагрузак на візітах увогуле няма.

Па графіку ўліку працоўнага часу на работу з дакументамі застаецца не больш як 20-30 хвілін, якіх, зразумела, недастаткова для афармлення ўсёй дакументацыі, вядзення флюаратэкі, імунатэкі, выбаркі звестак аб выкананых прышчэпках, аналізах, расклейвання звестак у амбулаторныя карты, выкліку пацыентаў на дыспансэрны агляд, флюараграфію, вакцынацыю, вядзення дакументацыі па патранажах і візітах, афармлення дыспансэрных картаў. Выкананне ўсіх гэтых функцый займае сама меней 60 хвілін, ці 10,6 працэнта працоўнага часу. Пры гэтым медыцынская сястра таксама павінна паспець спланаваць сваю работу з ільготнай катэгорыяй грамадзян і работу з картатэкай на ўчастку. За месяц участковая медыцынская сястра праводзіць яшчэ і 3 гутаркі ў рамках санітарна-асветніцкай работы.

— Праведзены аналіз красамоўна сведчыць, што ні **адна медыцынская сястра не ў стане выканаць усе ўскладзеныя на яе абавязкі на належным узроўні**, — дадаў Дзмітрый Шаўцоў. — Да таго ж такія празмерныя нагрузкі прыводзяць да развіцця сіндрому эмацыйнага выгарання, праблем са здароўем і сном, да парушэння правілаў аховы працы і, што вельмі важна, да здзяйснення прафесійных памылак, якія ўплываюць на здароўе пацыентаў.

Асобнай увагі заслугоўваюць вынікі апытання сястрынскага персаналу ўстаноў аховы здароўя першаснага звяна Савецкага раёна сталіцы, якія даюць багаты пажытак для роздуму. Падчас апытання 49,6 працэнта яго ўдзельнікаў паведамілі, што не адчуваюць павагі з боку пацыентаў за сваю працу, 47,9 працэнта медыцынскіх сёстраў не лічаць сваю работу прэстыжнай, 64,1 працэнта апытаных маюць праблемы са здароўем, 35,9 працэнта церпяць ад захворванняў сістэмы кровазвароту, 16,7 працэнта вымушаныя прымаць лекі для аднаўлення сну. Не задаволеныя сваімі заробкамі 94,9 працэнта рэспандэнтаў, прычым 97,4 працэнта не могуць забяспечыць сабе штогадовы паўнавартасны адпачынак.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

**ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ**

## ЗАБРУДЗІЛІ ПІТНУЮ ВАДУ

**Жыхары вёскі Загарадная Аршанскага раёна (сем'і Каско, Саўчанкаў, Ігнатовічаў, Логвінавых і іншых) звяртаюцца ў рэдакцыю нашай газеты, каб агучыць праблему, выкліканую паводкай.**

— Не, нашы хаты не падтапіла, але ў водазаборную шчыліну, адкуль паступае пітная вада ў жылыя дамы, праніклі сцёкі з жывёлагадоўчага комплексу «Задняпроўскі», які знаходзіцца непадалёк ад вёскі. Цяпер у водаправоднай сетцы нашых дамоў вада цёмнага колеру і з пахам аміяку!

Яшчэ ў лютым гэтага года мы звярталіся ў Аршанскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі, у КУП «Райжылфонд», у інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя з просьбай, каб службовыя асобы звярнулі ўвагу на тое, што работнікі свінагадоўчага комплексу РСУПП «Задняпроўскі» зліваюць вытворчыя сцёкі паміж шчылінамі водазабора пітной вады. (Дарэчы, шчыліна нават не загерметызаваная.) Але чыноўнікі на нашы лісты не адрэагавалі. З Аршанскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі нам прыслалі адпіску, што не могуць дапамагчы. Райжылфонд паведаміў, што няма калі займацца герметызацыяй шчыліны. І мы не ведаем, як дабіцца нармальнай пітной вады. Можа, газета агучыць нашу праблему і тым самым узварушыць службовых асобаў, якія нясуць адказнасць за водазабор, якасць пітной вады і здароўе жыхароў вёскі?

**ЗНАК БЯДЫ**

## ГІНУЦЬ ДЗЕЦІ...

**У Брэсцкай вобласці проста нейкая эпідэмія, нешчаслівая паласа: людзі гінуць у агні. Лік ідзе ўжо на дзясяткі. З пачатку гэтага года агонь забраў жыцці 44 чалавек. З іх пяцёра — малыя дзеці.**

Хоць параўнанне можа выглядаць недарэчным, але ж летась за цэлы год у рэгіёне загінула ў агні адно дзіця, а цяпер год толькі пачаўся, а страшны спіс вунь які. Загінула пяцёра, а жыцці яшчэ траіх былі на валаску, на шчасце, іх ратавалі пажарныя і адважныя відавочцы пажараў. І, як сведчаць праверкі, праведзеныя спецыялістамі, трагедыі адбываліся не ў праблемных, запушчаных у сацыяльным сэнсе сем'ях, а ў звычайных — гарадскіх і вясковых. Але ўсюды амаль па адным і тым жа сцэнарыі.

У Ружанах маці адышла ў краму па прадукты (наша газета сцісла паведамляла пра той ракавы пажар). Бацька сямейства быў на працы. Чатырохгадовы хлопчык знайшоў сабе забаву ў запалках. Ён падпаліў кучку рэчаў з газет, цацак, дробных адзежак. Гэта і загарэлася. А цяпер вядома якая мэбля, шторы, гардзіны, пакрывалы — спрэс сінтэтыка. Наша жытло нашпігаванае тым, што гарыць хутка і, галоўнае, выдзяляе з дымам атрутныя рэчывы. Дыхнуў пару разоў — і ратаваць няма каго. Так і было ў Ружанах. Маладая жанчына, калі ўбачыла дым з вокнаў, кінулася ўсярэдзіну дома. Яна вынесла на руках чатырохгадовага сына і двухгадовую дачушку. Знешне яны не выглядалі пацярпелымі, яна і не верыла, што дзеці нежывыя. На крыкі прыбегла суседка, разам яны стараліся даць нейкае рады, рабілі штучнае дыханне. Але медыкі «хуткай», што прыехала за лічаныя хвіліны,





бо ружанская медустанова знаходзіцца па суседстве з тым злашчасным домам па вуліцы Горкага, як гаворыцца ў пратаколе, «канстатавалі смерць».

Лаканічная мова афіцыйных дакументаў не ўтрымлівае эмоцый. Але не хопіць ніякіх слоў, каб перадаць чалавечае гора ад страты дзяцей такім вось недарэчным чынам. Гэта нават уявіць цяжка: стан маці каля сваіх памерлых дзяцей... Свядомасць бароніць мозг і сэрца, таму стараецца хутка змяніць малюнак на нешта іншае. І ніхто не адкажа на пытанне людзей, ахвяраў гэтай навалы, як ім жыць далей...

Прайшло колькі дзён пасля ружанскай трагедыі, сітуацыя паўтарылася ў фармаце адзін да аднаго ў Іванаве. Толькі дзеці ў доме па вуліцы Зоі Касмадзям'янскай былі старэйшыя. Пра гэты выпадак аўтару расказаў супрацоўнік абласнога ўпраўлення МНС Сяргей Машноў. Маці дзяцей выпраўлялася на працу, а бацька быў па дарозе з працы. Размінуліся яны на нейкія дзесяць-пятнаццаць хвілін. Гэтага часу хапіла, каб першакласнік Алег і яго трохгадовы брат Павел наладзілі гульню з запалкамі. Калі з вокнаў паваліў дым, суседзі выклікалі выратавальнікаў. Пажарныя перш-наперш вынеслі з агню дзяцей. Але старэйшы хлопчык памёр літаральна па дарозе ў бальніцу. А маленькага, трохгадовага, як аказалася, выносілі ўжо нежывога.

Праз тыдзень-другі зводкі ўпраўлення МНС зноў сведчаць пра трагедыю. У Камянецкім раёне загінула трохгадовая дзяўчынка, яе меншую сястрычку ўдалося выратаваць. Тут ужо нейкі нонсенс. Бацькі, абое, былі на працы, а дзяцей пакінулі адных. Такіх дзяцей пакідаць адных дома — значыць свядома рызыкаваць.

— Навучыць бацькоў не рызыкаваць сваімі дзецьмі, не пакідаць іх адных, а калі гэта здараецца хоць на некалькі хвілін, зрабіць доступ да запалак, запальніц, іншых небяспечных прадметаў немагчымым — звышзадача для ўсяго грамадства, — разважае начальнік цэнтра прапаганды і навучання пры Брэсцкім абласным упраўленні МНС Мікалай Кузьміцкі. —Здаецца, мы робім у гэтым кірунку вельмі шмат. Аказваецца, недастаткова. Нашы інспектары ва ўсіх раёнах разам з сельскімі Саветамі наведваюць шматдзетныя сем'і. А праблемныя сем'і заўсёды былі зонай павышанай увагі супрацоўнікаў пажарна-выратавальнай службы. У гэтыя сем'і мы ходзім, угаворваем, тлумачым, пагражаем санкцыямі. Мы знялі тэматычны фільм, круцім яго паўсюдна ў школах. Мы пайшлі нават да кіраўніцтва Брэсцкай і Пінскай епархій і знайшлі ў іх разуменне. Гэта значыць, святары падчас пропаведзяў будуць нагадваць прыхаджанам пра неабходнасць захавання правілаў пажарнай бяспекі і пра асаблівы клопат аб малалетніх.

У сувязі з тым, што пачасціліся выпадкі гібелі дзяцей, кіраўніцтва абласнога ўпраўлення МНС звярнулася ва ўпраўленне адукацыі з просьбай правесці пазачарговыя бацькоўскія сходы ў школах, а таксама на сходах чарговых заўсёды нагадваць бацькам пра небяспеку на прыкладах страшнай статыстыкі.

Вядома, ад няшчасця не застрахаваны ніхто на гэтым свеце. Але, як сведчаць супрацоўнікі адпаведных службаў, вельмі часта людзі не ўсведамляюць усёй велічыні адказнасці за жыццё і здароўе сваіх дзяцей. Таму і пакідаюць малых без нагляду, дапускаюць магчымыя гульні з запалкамі, значыць, пакідаюць забароненыя для дзяцей прадмет у зоне дасягальнасці. Вынікі бываюць непапраўнымі. Таму, вядома, варта лішні раз ісці ў школы і на прадпрыемствы, тлумачыць, прасіць, заклікаць. А што яшчэ застаецца?

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**АРЫФМЕТЫКА ГЛЫБІНКІ**

# «ПРЫВЯЗКА» ДА ЗЯМЛІ

**Калі пасля гарадской мітусні і тлуму трапляеш у вёску, першае, што пачынаеш адчуваць — запавольванне рытму жыцця. Ніхто нікуды не бяжыць і не спяшаецца. Людзей на вуліцы практычна няма. Працаздольныя — на «аб'ектах», старыя — у хатах, дзеці — у школе. Ды і ісці жыхарам невялікай вёскі асабліва няма куды: ФАП — у іншым населеным пункце (цэнтры сельсавета), крама, Дом культуры, бібліятэка — там жа...**



Фота Святланы МУЦЯНСКАЙ.

Старшыня Каменналогскага сельскага Савета Генрых РАЧКО.

Хоць, напэўна, вясковыя жыхары са мной не пагадзіліся б. (Як некалі я сама не пагадзілася са знаёмымі масквічамі, якія, прыехаўшы ў Мінск, не маглі звыкнуцца з «цішынёй» і ўвесь час пыталіся, чаму на вуліцах так мала (!) людзей.) Проста тут свой рытм, цесна звязаны з рытмам зямлі, яе абуджэннем і станам спакою.

«Да зямлі» прывязана жыццё і жыхароў Каменналогскага сельсавета Ашмянскага раёна — пераважная большасць працаздольнага насельніцтва мае непасрэднае дачыненне да СВК «Прыгранічны». На тэрыторыі сельсавета, які мяжуе з Літвой, знаходзіцца вядомы мытны пост «Каменны Лог», пры якім ёсць аўтазаправачная станцыя і кавярня. У кавярню заходзяць перакусіць мясцовыя механізатары. Нехта з вясковых дзяўчат уладкаваўся сюды на працу (таму што зарплата большая, чым у сярэднім па СВК). Але ў цэлым мытня жыве сваімі, адасобленымі клопатамі, якія практычна не ўплываюць на жыццё сельсавета.

Засталося ў ім, дарэчы, 915 жыхароў, а некалі гэта лічба перавышала 1,5 тысячы. Моладзь, нават свая, не затрымліваецца з-за невысокіх заробкаў. Хоць, сцвярджае старшыня Каменналогскага сельскага Савета Генрых Рачко, уласны кашалёк пры жаданні заўсёды можна папоўніць дадатковымі даходамі ад уласнай падсобнай гаспадаркі — напрыклад, здаючы дзяржаве малако. Ніякіх складанасцяў тут няма, усё вельмі проста.

Тут, прызнаюся, я з Генрыхам Іванавічам не пагадзілася. Якое там проста? Карова — гэта ж жывая істота, на якую, да таго ж, зроблена пэўная «стаўка»: яна ў некаторым сэнсе (а можа, і ў самым прамым) павінна «забяспечваць» сям'ю. А значыць, сама мае патрэбу ў старанным доглядзе. Яе трэба карміць, даіць, лячыць, пасвіць, трымаць у чыстаце.

— Ды я сам трымаю і карову, і свіней! Спраўляемся разам з жонкай без праблем. Увогуле, здзіўляюся цяперашняй моладзі — як можна жыць у вёсцы і не трымаць карову? І пры гэтым скардзіцца, што табе не хапае грошай? Гэта такая лайдацкая пазіцыя.

— А можа, вы ім не дапамагаеце?

— Што значыць не дапамагаем? Ну, не будзе ж СВК за іх карову трымаць. Сельгаспрадпрыемства можа толькі яе чалавеку прадаць, дапамагчы з кармамі, з апрацоўкай глебы, з выдзяленнем сенажаці... Той жа «Прыгранічны» нікому не адмаўляе ў продажы жывёлы — можна туды калі заўгодна звяртацца.

— І колькі карова будзе каштаваць?

— Прыкладна 2 мільёны рублёў.

Не самае таннае задавальненне, дарагавата нават для гарадскога кашалька... Але Генрых Іванавіч катэгарычна са мной не згодны.

— Давайце падлічым, — тут жа прапаноўвае ён і бярэ ў рукі калькулятар. — На сёння 1 літр малака каштуе ў сярэднім 650 рублёў (без уліку датацый). За год карова дасць як мінімум 3 тысячы кілаграмаў. Паўтараю — як мінімум! Памножым іх на кошт аднаго літра і атрымаем без малога 2 мільёны рублёў — той жа кошт каровы. Інакш кажучы, яна акупіцца за год, а далей пачне прыносіць гаспадарам прыбытак. Калі ж яшчэ і расцеліцца, можна выгадна, мінімум за 400 тысяч, прадаць цяля — таму ж самаму СВК «Прыгранічны», які зацікаўлены яго купіць.

У таго, хто працуе ў СВК, кажа Генрых Рачко, не павінна ўзнікаць праблем і з кармамі. Гаспадарка выдзяляе сваім работнікам па 3—5 рулонаў сена, прывозіць пад хату салому, у якасці дадатковай аплаты механізатарам выдаюць збожжа.

— А калі, напрыклад, я не механізатар, а настаўнік — тады як?

— Тады збожжа вам выдзеляць за грошы. Але сёлета было вельмі выгадна яго набываць — па 275 тысяч за тону. Гэта практычна сабекошт. Адной тоны збожжа цалкам хопіць, каб выгадаваць двух кабаноў. А для каровы аж занадта... З сенажацямі таксама праблем няма. Цяпер жа, не сакрэт, населеныя пункты, асабліва аддаленыя, пустуюць, участкаў хапае. Бярыце касу ў рукі і касіце — было б жаданне. І дазволу ў мяне пытацца не трэба — мясцовая ўлада зацікаўленая, каб зямля (тая, што знаходзіцца ў межах населенага пункта і належыць сельсавету) не зарастала. Самавольна нельга касіць толькі на пашах, якія належаць СВК. Я вам скажу, што з нашымі сенажацямі можна і па чатыры каровы трымаць, і па пяць.

Па шчырасці, такіх герояў у сельсавеце няшмат. Калі зусім дакладна, усяго адзін — жыхар вёскі Каршунішкі Эдуард Місель, які набыў нядаўна пятую па ліку карову і ўзяў у арэнду тры гектары зямлі. Эдуард Станіслававіч не адносіцца да ліку фермераў, але жыве выключна ад прыбытку, які прыносіць уласная падсобная гаспадарка.

— Безумоўна ж, я цікаўлюся, як рухаюцца ў яго справы, — расказвае старшыня сельскага Савета. — Нядрэнна! Спачатку ён здаваў малако дзяржаве. Але грошай, на яго думку, атрымлівалася малавата, асабліва для чалавека, які больш нідзе не працуе. Ён выбраў іншы шлях — возіць малочныя прадукты на рынак у Астравец (гэта ад іх бліжэй, чым Ашмяны). Жонка знайшла рэцэпты прыгатавання розных хатніх сыроў. І сёння яны карыстаюцца попытам. Цяпер сям'я цалкам перапрацоўвае малако на сыры, у сувязі з чым прыбытак павялічыўся ў два разы... Безумоўна, 4—5 кароў — гэта ўжо няпроста, але людзям захацелася зарабіць. А іншага шляху ў сельскай мясцовасці практычна няма.

Генрых Іванавіч зноў бярэцца за калькулятар. Атрымліваецца, што чатыры каровы дадуць 8 мільёнаў прыбытку за год (або 670 тысяч у месяц). Такі мінімум можна атрымаць без асаблівага рвення. Так што, прыходзіць да лагічнай высновы старшыня сельскага Савета, сэнс у гэтым ёсць. Асабліва калі атрымліваеш у калгасе невялікі заробак.

— А жыць у вёсцы і плакацца, што ты бедны — даруйце... Тым больш незразумела, калі скардзяцца маладыя. Маеш кавалак зямлі і не можаш звесці канцы з канцамі — значыць, лайдак.

На тэрыторыі Каменналогскага сельсавета 388 уласных падворкаў. Каровы ўтрымліваюцца на 147 з іх — лічы, на кожным трэцім. Тэндэнцыя да змяншэння іх колькасці таксама адчуваецца, як і паўсюль, але тэмпы скарачэння не такія імклівыя, як у некаторых іншых рэгіёнах. У свой час гэта тэрыторыя знаходзілася «пад палякамі», і людзі навучыліся ад іх стараннасці і працавітасці, якія потым «перадаваліся» ў спадчыну, — тлумачыць Генрых Іванавіч такую прывязанасць сваіх аднавяскоўцаў да зямлі.

Але вёскі ўсё адно пусцеюць. Скарачаецца колькасць крамаў, школ, ФАПаў — ім няма каго вучыць, лячыць, абслугоўваць. На тэрыторыі сельсавета з трынаццаці «жылых» хутароў засталося толькі шэсць. Жывуць там пераважна сталыя людзі, і пераканаць іх змяніць месца жыхарства (перабрацца бліжэй да дзяцей) вельмі складана. Хутар — гэта не проста дом і кавалак зямлі, якія знаходзяцца ў пэўнай аддаленасці ад іншых населеных пунктаў. Гэта яшчэ і своеасаблівая псіхалогія. Сёння ўсе хутары ў сельсавеце электрыфікаваныя. На кожным падворку ёсць свой калодзеж, а газ можна заказаць па тэлефоне — яго прывозяць у спецыяльных балонах. З іншых выгод — аўтакрама, якая прыязджае два разы на тыдзень... Але сумаваць гаспадарам хутароў не даводзіцца. Пакуль могуць рухацца, яны занятыя працай. Гэта «цяга» ў іх у крыві, бо перадалася з генамі ад бацькоў, а тым — ад сваіх бацькоў.

Вяртаючыся з Каменнага Лога ў Ашмяны, мы заехалі на хутар Мерлішкі, у госці да Марыі Іванаўны і Яўгена Станіслававіча Лісоўскіх. Хату на хутары будавалі яшчэ бацькі Яўгена Станіслававіча. Сюды ж ён прывёў потым сваю жонку, тут у іх нарадзілася чацвёра дзяцей...

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

**ВЫБАРЫ-2010**

# ЧАСІНА ЧАКАННЯ

## Кандыдатам у дэпутаты мясцовых Саветаў пара ўжо агітаваць за сябе



*Да выбараў часу ўсё менш, аднак імі пакуль, можна сказаць, і не пахне: людзям, якія не штудзіруюць штодня стужкі навінаў, пра гэта нагадваюць хіба што інфармацыйныя плакаты «25 красавіка — дзень выбараў» ды стэнды для лістовак кандыдатаў, збольшага... Лакальныя беларускія выбары традыцыйна абвінавачваюць у шэрасці і непрыкметнасці. Часта ляціць каменне і ў агарод саміх мясцовых Саветаў: маўляў, асноўная іх функцыя — дэкаратыўная, паўнамоцтваў — мінімум, папулярнасці — яшчэ менш. Перад выбарамі такія настроі заўжды падаграваюцца: маўляў, нашто выбірацца і выбіраць... Шмат спрэчак выклікае і яшчэ адзін аспект — як выбіраць: ці змянілася нешта з увядзеннем новых правілаў электаральнай «гульні». Як знайсці залатую «мяжу», каб не атрымалася, што ў агітацыі, як на вайне — усе сродкі добрыя? Карацей, нагодаў для разважання — хоць адбаўляй. Дык давайце разважаць! Разам з сакратаром ЦВК Мікалаем ЛАЗАВІКОМ.*

**— Як уплывае на выбары імідж «слабага звяна», які нярэдка прыпісваюць мясцовым Саветам?**

— Парог яўкі адменены новаўвядзеннямі ў заканадаўстве, таму выбары ў любым выпадку адбудуцца. Аднак людзі часта недаацэньваюць ролю Савета — асноўнага звяна сістэмы мясцовага самакіравання. Я сам не ведаю, хто там дэпутат па маёй акрузе, аднак гэта не азначае, што Савет дрэнна працуе: галоўнае, што ён робіць, — зацвярджае праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця канкрэтнай тэрыторыі і яе бюджэт. А менавіта ад гэтага залежыць, як будуць працаваць усе службы. Ад узроўню работы Савета, такім чынам, залежыць узровень дабрабыту кожнага жыхара. Ну а наконт таго, што яны быццам не валодаюць дастатковай уладай для вырашэння праблем і хапіла б адных выканкамаў... Магу сказаць, што мясцовая «вертыкаль» працуе па прынцыпе «зверху — уніз», усе рашэнні, прынятыя наверсе, дакладна выконваюцца, аднак голас знізу — асобнага грамадзяніна з якога-небудзь аддаленага пасёлка, можа быць і не пачуты. Дык вось на тое і патрэбныя Саветы: каб голас знізу быў пачуты. Інтарэс электарату да выбараў традыцыйна больш высокі на першасным узроўні, асабліва ў сельскія Саветы, а конкурс заўжды вышэйшы ў гарадах. Проста ў сельскі Савет мясцовыя жыхары звяртаюцца вельмі часта — наконт вылучэння зямельных участкаў, рэалізацыі лішкаў сельскагаспадарчай прадукцыі, набыцця паліва і гэтак далей, таму ім не ўсё адно, хто там будзе працаваць. Гараджане ж лічаць за лепшае ў нейкай праблемнай сітуацыі звярнуцца непасрэдна ў службу — жыллёва-камунальную, скажам, ці аховы здароўя. З іншага боку, у дэпутата і сельскага, і Мінскага гарадскога Савета адказнасць аднолькава вялікая, толькі вось рэсурсаў для вырашэння праблемных пытанняў у апошняга значна больш. Ды і рашэнні яго маюць значна большую вагу — яны распаўсюджваюцца на большую колькасць людзей і ўстаноў, больш маштабна рэалізуюцца. Таму конкурс тут заўжды вышэйшы. Так, сёлета на адно дэпутацкае месца ў сталічным гарсавеце прэтэндуе амаль чатыры кандыдаты, а ў сельскіх Саветах — 1,1.

**— Гэта электаральная кампанія — дэбютная ў плане прымянення абноўленага заканадаўства. Якія папярэднія высновы ўжо можна зрабіць?**

— Прынамсі тое, што ўдзел у выбарах палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў (ГА) палегчаны. Для многіх партыйных лідараў стала нечаканасцю, што для іх прадстаўнікоў будуць настолькі шырока адчыненыя дзверы ў выбаркамы. Квота (не менш чым траціна) прадстаўнікоў партый і ГА ў выбаркамах выкананая з запасам. Ды і ў якасці кандыдатаў партыйцаў зарэгістравана ўтрая больш, чым на папярэдніх мясцовых выбарах — адмовы адзінкавыя. У асобных камісіях дастаткова жорстка падышлі да разгляду дакументаў — практыка мінулых гадоў захавалася. Там, дзе яны перагнулі палку, вышэйстаячыя камісіі паправяць... Увогуле ж у большасці камісій быў больш лаяльны падыход у параўнанні з ранейшай практыкай. А выказванні пра тое, што змены ў выбарчым заканадаўстве чыста фармальныя і ніякіх паляпшэнняў няма — хутчэй, рыторыка, якая ідзе следам за дрэннай работай. Асобныя партыі заяўляюць пра байкот выбараў... Аднак ён нейкі аперэтачны — каб зняць кандыдатаў з удзелу ў выбарах, неабходная працэдура, аналагічная вылучэнню: партыя павінна прыняць адпаведнае рашэнне і скіраваць яго ў выбаркам. Такіх рашэнняў дагэтуль не паступала. Хачу запэўніць, што з боку выбаркамаў ніякіх рэпрэсій не будзе — яны не стануць адмяняць рашэнне аб рэгістрацыі кандыдатаў на падставе дэкларатыўных заяў.

**— Ці не занадта сціплыя магчымасці кандыдатаў для «прываблівання» электарату — можа, у гэтым прычына непрыкметнасці муніцыпальных выбараў?**

— Проста ўсё фінансаванне выключна бюджэтнае, магчымасць прыцягваць асабістыя сродкі і ахвяраванні спонсараў з'явіцца толькі на наступных прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбарах. Так, для вырабу друкаванай прадукцыі кандыдатам вылучаюцца невялікія сумы: восем базавых велічыняў (280 тыс. рублёў) — кандыдатам у Мінскі гарадскі і абласныя Саветы, удвая менш — кандыдатам у Саветы раёнаў і гарадоў абласнога падпарадкавання, а на першасным узроўні і наогул толькі 35 тысяч. Аднак і гэта многія кандыдаты не выкарыстоўваюць. Калі там яго і так усе добра ведаюць як свайго суседа, навошта нейкія лістоўкі?! Зэканомленыя сродкі вяртаюцца ў рэспубліканскі бюджэт і ідуць на агульнадзяржаўныя патрэбы. А вось ужо на больш высокіх узроўнях, у гарадах, дзе часам нават суседзі па лесвічнай пляцоўцы адзін аднаго не ведаюць, дарэчы і дадатковыя формы агітацыі. Яны дзяржавай гарантуюцца, варта толькі імі карыстацца ў поўнай меры. Кандыдаты ў дэпутаты, пачынаючы ад раённага звяна, могуць звярнуцца да выбаршчыкаў па радыё — пяць хвілін у эфіры ім даецца бясплатна. Можна праводзіць сустрэчы з выбаршчыкамі (памяшканні для гэтага таксама вылучаюцца бясплатна), мітынгі (на іх не патрэбен асобны дазвол — дастаткова праінфармаваць выбаркам), абыходзіць па кватэрах, распаўсюджваць лістоўкі па паштовых скрынях, развешваць на спецыяльных стэндах. Дарэчы, іх усталяванне — ініцыятыва мясцовых уладаў, якія клапоцяцца пра знешні выгляд горада. Без іх лістоўкі звычайна з'яўляюцца на слупах ды пад'ездах, а калі здзіраюцца, то атрымліваецца зусім непрывабна. У нас, на жаль, захоўваецца даўняя традыцыя «вайны лістовак»: праходзіць ініцыятыўная група аднаго кандыдата, расклейвае лістоўкі, а следам ідуць паплечнікі іншага і... зрываюць выявы канкурэнта, прымацоўваюць сваю прадукцыю! Так што выбаршчыкі часта застаюцца без поўнай інфармацыі пра склад кандыдатаў. Таму акруговыя і тэрытарыяльныя выбаркамы адказныя за выраб агульных плакатаў з інфармацыяй пра ўсіх кандыдатаў па акрузе — зрываць плакат ужо проста не будзе сэнсу. За такія парушэнні, дарэчы, прадугледжаная адміністрацыйная адказнасць.

**— Якія яшчэ прыёмы, апроч «вайны лістовак», забароненыя падчас агітацыі?**

— Удзельнікі выбараў увогуле павінны паводзіць сябе карэктна. Не дапускаць паклёпу ў дачыненні да іншых кандыдатаў, заклікаў да вайны, звяржэння канстытуцыйнага ладу, распальвання расавай, рэлігійнай, іншай варожасці. Ну і, вядома ж, пэўныя выбаркамаўскія патрабаванні ёсць: калі кандыдата зловяць на выкарыстанні іншых сродкаў, апроч вылучаных камісіяй, стане пытанне аб вынясенні яму папярэджання ці адмене рэгістрацыі. Ну а калі размова ідзе пра сродкі з-за мяжы, то гэта адназначная падстава для адмены рашэння аб рэгістрацыі.

**— На кожны дэпутацкі мандат прэтэндуе ў сярэднім па краіне 1,2 кандыдата — конкурс, хоць і вышэйшы, чым на трох папярэдніх мясцовых выбарчых кампаніях, аднак усё адно вельмі нізкі, а значыць, у большасці акруг у выбаршчыкаў проста не будзе... выбару?**

— Выбар заўжды ёсць! У бюлетэні абавязкова будзе два квадраты — «за» і «супраць». Безальтэрнатыўныя выбары адлюстроўваюць узровень даверу мясцовых жыхароў да гэтага кандыдата. Выбары адбудуцца тады, калі больш чым палова тых, хто прыйшоў галасаваць, выкажуцца «за».

**— Па традыцыі гэта можна будзе зрабіць не толькі 25 красавіка і не толькі на ўчастку?**

— Датэрміновае галасаванне застаецца, гэта неабходная норма. Яна дае больш шырокія магчымасці грамадзяніну рэалізаваць сваё выбарчае права. Такую форму галасавання трэба развіваць, асабліва ў гарадах — тут насельніцтва больш мабільнае: студэнты на выхадныя ездзяць дадому, пенсіянеры — на летнік. Трэба ісці насустрач выбаршчыку, які хоча прагаласаваць датэрмінова. Гэта можна будзе зрабіць пачынаючы з 20 красавіка. А вось у сельскай мясцовасці «заарганізоўваць» датэрміновае галасаванне не варта: заўжды здзіўляе, калі ледзь не палова пасёлка галасуе датэрмінова. Тамтэйшыя жыхары, як правіла, нікуды не з'язджаюць, а ў дзень выбараў ім галасаваць больш прыемна і цікава: там мясцовая самадзейнасць канцэрт зладзіць, ёсць магчымасць сустрэцца, пагутарыць, ва ўсіх святочны настрой. І нейкая «заарганізаванасць» тут залішняя. Тым, хто не ў стане прыйсці на выбарчы ўчастак, можна будзе прагаласаваць дома — у асноўны дзень выбараў. Для гэтага трэба ўсяго толькі звярнуцца ва ўчастковую камісію. Зрабіць гэта можна як напярэдадні асноўнага дня выбараў, так і непасрэдна 25 красавіка — не пазней, чым за дзве гадзіны да закрыцця ўчастка. Працаваць яны будуць, як заўжды, з 8.00 да 20.00.

**— Агітацыя пачалася, аднак яна чамусьці яшчэ зусім не адчуваецца — стэнды ў горадзе пустуюць...**

— Ну, кандыдаты яшчэ не разварушыліся. Пакуль яны замовяць друкаваную прадукцыю ў друкарні, а выбаркамы іх па безнаяўным разліку аплацяць... Трэба пачакаць.

*Што ж, відаць, гэтыя першыя дні перадвыбарнай агітацыі — час чакання: неабходна разабрацца з арганізацыйнымі момантамі — памяшканні, лістоўкі, плакаты... Будзем чакаць! Галоўнае, каб чаканне не зацягнулася надоўга, да канца выбараў...*

**Ала МАЧАЛАВА.**

**ПРЭС-РЭЛІЗ**

# «МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ЎЛАДЫ Ў ЛЮСТЭРКУ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ»

Вынікі сацыялагічнага апытання, праведзенага Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (ІАЦ), паказалі, што большасць насельніцтва краіны ў цэлым давярае мясцовым органам улады, — гэта адзначылі амаль 60 % рэспандэнтаў. Гэта тэндэнцыя характэрная для ўсіх рэгіёнаў, уключаючы г. Мінск (гл. дыяграму 1).

**Дыяграма 1**

**Ступень даверу грамадзян мясцовым органам улады**
*(у % ад колькасці апытаных)*




Грамадзяне ў асноўным здавальняюча ацэньваюць дзейнасць органаў мясцовага кіравання і самакіравання гарадскога і раённага ўзроўняў. Так, 64 % апытаных паставілі «добра» і «здавальняюча» працы гаррайвыканкамаў, раённых адміністрацый буйных гарадоў, 62 % — гарадскім і раённым Саветам.

Больш станоўча ацэньваюць працу раённых уладаў вясковыя жыхары (гл. дыяграму 2).

**Дыяграма 2**

**Ацэнка работы гаррайвыканкамаў, мясцовых Саветаў гарадскім і вясковым насельніцтвам**
*(у % ад колькасці апытаных)*




Згодна з атрыманымі звесткамі, старшыні раённых (гарадскіх) выканкамаў, кіраўнікі адміністрацый добра вядомыя 54 % гарадскіх і 76 % вясковых жыхароў (гл. дыяграму 3).

**Дыяграма 3**

**Пазнавальнасць грамадзянамі кіраўнікоў гаррайвыканкамаў, кіраўнікоў адміністрацый раёнаў**
*(у % ад колькасці апытаных)*




Большасць рэспандэнтаў (да 83 %), якія звярталіся ў органы мясцовай улады, ацэньваюць узровень арганізацыі прыёму грамадзян як сярэдні і высокі.

Доля негатыўных ацэнак не перавышае 12 % (гл. дыяграму 4).

**Дыяграма 4**

**Ацэнка ўзроўню арганізацыі прыёму грамадзян, якія звярталіся да мясцовых уладаў**
*(у % ад колькасці грамадзян, якія звярталіся)*




Сацыялагічнае апытанне праведзена ў кастрычніку-лістападзе 2009 г. па рэспубліканскай выбарцы метадам інтэрв'ю «твар у твар». Па месцы жыхарства было апытана 1976 чалавек ва ўсіх абласных цэнтрах краіны і ў г. Мінску, шэрагу раённых гарадоў і сельскіх населеных пунктаў. Статыстычная памылка не перавышае 3 %. Гэта дазваляе сцвярджаць, што вынікі даследавання адлюстроўваюць думкі і ацэначныя суджэнні дарослага насельніцтва краіны.

# «ПРЫВЯЗКА» ДА ЗЯМЛІ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Сёння два сыны Лісоўскіх жывуць у Каменным Логу (за 4 км ад хутара), яшчэ адзін сын і дачка — у райцэнтры. Хоць і не пад адным дахам, але непадалёк — і прадукты падвязуць, і па гаспадарцы, калі трэба, дапамогуць. Хоць са сваёй немаленькай гаспадаркай Марыя Іванаўна і Яўген Станіслававіч (якім у наступным годзе споўніцца па 80 гадоў) спраўляюцца ў асноўным самі. Да цяжкіх фізічных нагрузак ім не прывыкаць — усё жыццё аддадзенае працы на ферме. Ды і пенсіі ў Лісоўскіх зусім невялікія — 700 тысяч рублёў на дваіх. Так што без падсобнай гаспадаркі не абысціся. Яўген Станіслававіч увогуле называе карову неабходным «дадаткам да жыцця» і сцвярджае, што трымаць яе выгадна.



Фота Святланы МУЦЯНСКАЙ.

Марыя Іванаўна і Яўген Станіслававіч ЛІСОЎСКІЯ.

— Карову доім самі, малако здаём дзяржаве — прыязджаюць па яго без збояў, зімой праз дзень, а ўлетку, калі пачнецца «вялікае малако», кожны дзень, — расказваюць Лісоўскія.

Ім самім многа малака не трэба, а масла яны не вырабляюць і практычна не ўжываюць, бо пры высокім ціску гэта шкодна... Калі Марыю Іванаўну ўсё ж «прыціскае» і яна трапляе ў бальніцу, уся гаспадарка — карова, конь, свінні, куры і гектар зямлі ў дадатак — кладзецца на плечы Яўгена Станіслававіча. Ён і доіць за жонку, і на агародзе завіхаецца. Калі не спраўляецца — дапамагаюць дзеці.

— Збожжа ўвосень убірае калгасны камбайн — бяруць з нас за гэта няшмат, недзе па 2,5 тысячы рублёў за «сотку». Ну а бульбу капаем самі, пад конікам, — распавядае гаспадар.

Дзень у Лісоўскіх пачынаецца а 7 гадзне і за звычайнымі штодзённымі клопатамі праходзіць незаўважна. Ды і не «працай адзінай» жывуць гаспадары хутара. Калі маеш восем унукаў і столькі ж праўнукаў, ёсць пра каго паклапаціцца — і ў госці з'ездзіць, і ў сябе прыняць. А ў доўгія зімовыя вечары выручае тэлевізар.

— Вы якія перадачы гледзіце? — цікаўлюся ў гаспадароў.

— «Поле цудаў» падабаецца. І яшчэ Малахава вельмі любім...

— Таго, каторы лечыць народнымі сродкамі?

— Ды не, Андрэя! І перадача цікавая, і ён нічога сабе...

Старшыня сельскага Савета пытаецца, ці не патрэбна Лісоўскім дапамога — напрыклад, сацыяльны работнік? Ён, калі неабходна, можа ў хаце прыбраць, вады наносіць, дроў прынесці...

— Не, — адмахваецца Яўген Станіслававіч, — з такой работай мы, дзякуй Богу, спраўляемся самі.

А вось што сапраўды трэба Лісоўскім — гэта аднавіць агароджу з боку дарогі. І хоць, па словах Генрыха Рачко, сельвыканкам аднаўляе штыкетнік за дзяржаўныя сродкі толькі ў вялікіх вёсках на цэнтральных вуліцах, у гэтым выпадку выключэнне з правіла не будзе супрацьзаконным. Такім людзям, як Яўген Станіслававіч і Марыя Іванаўна, не грэх і дапамагчы...

**Наталля КАРПЕНКА,**
*Ашмянскі раён.*


**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ЗАСО «Виктория» за 2009 год**
220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65А, комн. 104

млн руб.

| АКТИВ 1 | 2 |
|---|---|
| **Основные средства** | **63,0** |
| **Нематериальные активы** | **3,4** |
| **Финансовые вложения, всего** | **1530,9** |
| в том числе: инвестиции в дочерние общества | – |
| инвестиции в другие организации | – |
| облигации и другие долговые обязательства | 1530,9 |
| прочие финансовые вложения | – |
| **Доля перестраховщиков в страховых резервах** | **489,7** |
| **Дебиторы, всего** | **7,0** |
| в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | – |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | – |
| дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 7,0 |
| **Прочие активы, всего** | **3383,1** |
| в том числе: незавершенное строительство | – |
| материальные ценности и затраты | 50,0 |
| денежные средства | 3333,1 |
| собственные акции (доли) | – |
| прочие активы | – |
| **Непокрытые убытки прошлых лет** | **–** |
| **Непокрытые убытки отчетного года** | **–** |
| **БАЛАНС** | **5477,1** |

| ПАССИВ 3 | 4 |
|---|---|
| **Источники собственных средств, всего** | **2979,1** |
| в том числе: уставный фонд | 2408,3 |
| резервный фонд | 18,7 |
| добавочный фонд | 64,6 |
| фонд накопления | 73,0 |
| фонд потребления | 12,3 |
| целевое финансирование | – |
| нераспределенная прибыль прошлых лет | – |
| нераспределенная прибыль отчетного года | 402,2 |
| **Страховые резервы и фонды, всего** | **2428,3** |
| в том числе: страховые резервы | 2350,2 |
| фонд (резерв) предупредительных мероприятий | 78,1 |
| гарантийные фонды | – |
| **Кредиторы, всего** | **48,8** |
| в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования, перестрахования | – |
| кредиторская задолженность по операциям перестрахования | – |
| депо премий по рискам, переданным в перестрахование | – |
| Заемные средства | – |
| кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования | 48,8 |
| Прочие пассивы | 20,9 |
| **БАЛАНС** | **5477,1** |

Достоверность баланса подтверждена аудиторским обществом с дополнительной ответственностью «ГлобалАудит» (лицензия № 02200/0416620 от 14.11.2005 г., выдана Министерством финансов Республики Беларусь).

Результаты проведенной проверки за период с 1 января 2009 г. по 31 декабря 2009 г. показывают, что отчетность ЗАСО «Виктория» сформирована в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗАСО «Виктория» на 1 января 2010 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год, при этом совершенные ЗАСО «Виктория» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

УНП 100219658

**ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ЗАСО «Виктория» за 2009 год**
220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65А, комн. 104

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| **I. Страхование жизни** Страховые взносы (премии) | 010 | – |
| Страховые выплаты | 020 | – |
| Изменение по страхованию жизни (+ или - ) | 030 | – |
| Отчисления в гарантийный фонд | 040 | – |
| Расходы на ведение дела | 041 | – |
| Результат от операций по страхованию жизни (+ или -) | 050 | – |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** Страховые взносы (премии) – нетто перестрахование | 064 | 3483,3 |
| Изменение резерва незаработанной премии – нетто перестраховаание (+ или - ) | 067 | 792,9 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) – нетто перестрахование | 082 | 292,6 |
| Изменение резервов убытков – нетто перестрахование (+ или - ) | 092 | 37,5 |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | 100 | – |
| Изменение иных страховых резервов (+ или -) | 105 | – |
| Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 110 | 42,6 |
| Расходы на ведение дела | 120 | 726,9 |
| Комиссионное вознаграждение и татьемы по рискам, переданным в перестрахование | 121 | 69,2 |
| Комиссионное вознаграждение и татьемы по рискам, принятым в перестрахование | 122 | 18,3 |
| **Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)** | **130** | **–** |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные к разделу I и II** | | |
| Операционные доходы | 140 | 189,2 |
| Операционные расходы | 145 | 21,2 |
| Внереализационные доходы | 150 | 699,2 |
| Внереализационные расходы | 155 | 60,7 |
| Финансовый результат | 157 | 4109,0 |
| Использование прибыли | 158 | 3706,8 |
| Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -) | 170 | 402,2 |


# АДТОК КАДРАЎ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

На пытанне, ці даводзіцца вам затрымлівацца пасля заканчэння працоўнай змены, 44,4 працэнта рэспандэнтаў адказалі, што даводзіцца, прычым даволі часта, а 27,4 працэнта — затрымліваюцца пастаянна. Ад 30 да 60 хвілін затрымліваюцца на працы 39,3 працэнта медыцынскіх сёстраў, больш за гадзіну — 31,6 працэнта. Сярод прычын затрымак на працы 64,1 працэнта апытаных назвалі засілле справаздачнасці, 59,8 працэнта — перавышэнне нагрузак.

На пытанне, ці падабаецца ім работа, 58,1 працэнта ўдзельнікаў апытання далі станоўчы адказ, а 11,1 працэнта — адмоўны. 13,7 працэнта паведамілі, што шукаюць іншую работу, прычым 39,3 працэнта медыцынскіх сёстраў гатовыя ўвогуле пайсці з сістэмы аховы здароўя. 68,4 працэнта медыцынскіх сёстраў скардзяцца на тое, што ім даводзіцца выконваць не ўласцівую іх прафесіі работу.

42,7 працэнта апытаных першачарговай задачай у рабоце лічаць зніжэнне нагрузак. 85,5 працэнта медыцынскіх сёстраў паведамілі, што для таго, каб адпавядаць сучасным патрабаванням, ім патрэбныя курсы павышэння кваліфікацыі...

— Для павышэння якасці і эфектыўнасці працы сястрынскага персаналу трэба распрацаваць нарматывы нагрузкі і стварыць сістэму экспертнай ацэнкі якасці работы, — падкрэсліў Дзмітрый Шаўцоў. — Статус медыцынскай сястры сёння неабгрунтавана заніжаны, сястрынскі патэнцыял не рэалізуецца ў поўнай меры, а матывацыя кваліфікаваных кадраў застаецца шмат у чым дэкларатыўнай...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## УЗЯЎ І ПАЙШОЎ...

У краму па вуліцы Іркуцка-Пінскай дывізіі ў Пінску зайшоў жыхар вёскі Ахова, узяў сем бутэлек гарэлкі і спакойна рушыў да выхаду. Невядома, на што спадзяваўся злодзей, але прадаўцы выклікалі міліцыю, і незаконны экспрапрыятар быў затрыманы. А ў Брэсце тым часам двое непрацуючых зайшлі ў гандлёвы павільён па праспекце Машэрава і прыхапілі два камплекты жаночай бялізны. Але «дам сэрца» адарыць не паспелі, бо таксама былі затрыманыя.

**Яна СВЕТАВА.**

## ПАЦЯРПЕЛІ АД ПАВОДКІ

Як паведамляюць у прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, зараз узровень вады ў Прыпяці на 12 см перавышае небяспечны. У Петрыкаўскім, Жыткавіцкім і Калінкавіцкім раёнах вобласці падтоплена 17 населеных пунктаў, а ў іх 114 падворкаў. Акрамя таго, часткова перамыта дарога, якая злучае вёску Снядзін Петрыкаўскага раёна з «вялікай» зямлёй. Па інфармацыі прэс-службы, неабходнасці ў адсяленні пакуль не ўзнікае. Пры гэтым усе падраздзяленні знаходзяцца ў поўнай гатоўнасці.

## РАЗУКАМПЛЕКТАВАЎ ЭКСКАВАТАРЫ

Невядомы злодзей уначы забраўся ў машынныя адсекі тэхнікі, што стаяла ў 2 кіламетрах ад вёскі Сініцкае поле Лельчыцкага раёна. Менавіта там праводзіліся меліярацыйныя работы, пры правядзенні якіх і патрэбны экскаватары. Зламыснік пазбавіў іх 6 акумулятарных батарэй, 3 камплектаў ключоў, 12 амартызатараў пад'ёма накрыўкі капота, рукава масленага радыятара — усяго на суму амаль 2,5 млн рублёў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ. Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

❑ реквизиты банковского счета владельца облигаций для безналичного перечисления денежных средств от продажи облигаций;

❑ учетный номер плательщика;

❑ юридический/почтовый адрес, контактные телефоны владельца облигаций;

❑ подпись уполномоченного лица владельца облигаций.

Подача заявления осуществляется в срок не позднее 5 рабочих дней до даты выплаты процентного дохода за соответствующий процентный период по факсу (017) 2183626(27), с обязательным предоставлением оригинала в течение 3 рабочих дней по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2.

В даты, отличающиеся от дат выплат процентных доходов, эмитент имеет право выкупать облигации в иные сроки и по договорной цене.

Эмитент может совершать следующие операции с выкупленными облигациями:

❑ продавать на вторичном рынке по договорной цене;

❑ досрочно погашать с прекращением обязательств по облигациям в силу совпадения должника и кредитора в одном лице согласно статье 383 Гражданского кодекса Республики Беларусь;

❑ иные операции, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

**14. Порядок погашения облигаций.**

При погашении владельцам облигаций 11-го, 12-го, 13-го и 14-го выпусков выплачивается номинальная стоимость облигаций, а при погашении облигаций 12-го, 13-го и 14-го выпусков также выплачивается процентный доход за последний процентный период.

Погашение облигаций 11-го, 12-го, 13-го и 14-го выпусков производится в пользу владельцев облигаций, являющихся таковыми по состоянию на соответствующую дату, на которые формируется реестр владельцев облигаций, для целей погашения облигаций, указанных в пункте 8 настоящей Краткой информации, на основании реестра владельцев облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в валюте номинала облигаций путем перечисления в безналичном порядке на счет владельца облигаций.

В случае, если дата погашения облигаций приходится на выходной либо праздничный день, то погашение осуществляется в следующий за выходным либо праздничным днем рабочий день. Проценты за вышеуказанные выходные либо праздничные дни не начисляются и не выплачиваются.

Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями с соответствующих дат, на которые формируется реестр владельцев облигаций, для целей погашения облигаций, указанных в пункте 8 настоящей Краткой информации.

При отсутствии в реестре владельцев облигаций реквизитов банковского счета для безналичного перечисления денежных средств, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете эмитента до непосредственного обращения (подачи заявления) владельца облигаций. Заявление должно содержать следующие реквизиты:

❑ полное наименование владельца облигаций;

❑ наименование ценной бумаги;

❑ количество ценных бумаг;

❑ реквизиты банковского счета владельца облигаций для безналичного перечисления денежных средств;

❑ учетный номер плательщика;

❑ юридический/почтовый адрес, контактные телефоны владельца облигаций;

❑ подпись уполномоченного лица владельца облигаций.

Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета эмитента по реквизитам счетов владельцев облигаций.

**15. Период начисления процентного дохода по облигациям 12-го, 13-го и 14-го выпусков.**

Процентный доход по облигациям 12-го, 13-го и 14-го выпусков за первый процентный период начисляется с календарного дня, следующего за датой начала размещения облигаций, по дату его выплаты включительно. Доход по остальным периодам, включая последний, начисляется с календарного дня, следующего за датой выплаты дохода за предшествующий процентный период, по дату выплаты дохода за соответствующий процентный период (дату погашения) включительно.

**16. Цена продажи облигаций.**

**16.1. Минимальная цена продажи облигаций 11-го выпуска. Цена продажи облигаций 11-го выпуска.**

Цена продажи (минимальная цена продажи) одной облигации 12.04.2010 составляет 863701 (Восемьсот шестьдесят три тысячи семьсот один) белорусский рубль.

Начиная с 13.04.2010 продажа облигаций осуществляется по цене, равной текущей стоимости облигации, рассчитываемой по следующей формуле:

$$С = 863701 + (863701*Пс*Т)/(100*365),$$

где:

С – текущая стоимость дисконтных облигаций.

Пс – доходность, рассчитанная исходя из цены продажи на дату начала размещения дисконтных облигаций (16 процентов годовых).

Т – количество дней обращения дисконтных облигаций данного выпуска. Количество дней обращения дисконтных облигаций определяется с даты начала их размещения по дату расчета их текущей стоимости. При этом день начала размещения дисконтных облигаций и день расчета их текущей стоимости считаются одним днем.

**16.2. Цена продажи облигаций 12-го, 13-го и 14-го выпусков.**

Продажа облигаций осуществляется по цене, равной текущей стоимости облигации, рассчитываемой по следующей формуле:

$$С = Н + НКД,$$

где:

С – текущая стоимость облигации.

Н – номинальная стоимость облигации.

НКД – сумма накопленного процентного дохода.

В день начала открытой продажи облигаций 12-го, 13-го и 14-го выпусков, а также в каждый день выплаты процентного дохода цена одной облигации равна номинальной стоимости. Начиная с календарного дня, следующего за датой начала открытой продажи облигаций, а также с календарного дня, следующего за датой выплаты процентного дохода за предшествующий период, цена одной облигации равна номинальной стоимости плюс накопленный процентный доход за текущий процентный период. Продажа облигаций не осуществляется в период со дня закрытия реестра для целей выплаты текущего процентного дохода до даты выплаты текущего процентного дохода (соответствующие даты указаны в Таблице 1 и Таблице 2).

Накопленный процентный доход за текущий процентный период по облигациям 12-го выпуска рассчитывается:

$$НКД = ((Н*П_1)/100)*(К_1/365)+((Н*П_2)/100)*(К5_2/365)+((Н*П_n)/100)*(К_n/365),$$

где:

НКД – сумма накопленного процентного дохода (белорусский рубль).

Н – номинальная стоимость облигации.

$П_1$, $П_2$, $П_n$ – процентная ставка по соответствующему процентному периоду (процентов годовых) за соответствующую часть процентного периода, в течение которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь оставалась неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 4 процентных пункта.

$К_1$, $К_2$, $К_n$ – количество дней периода начисления процентного дохода, в течение которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь не изменялась.

Накопленный процентный доход за текущий процентный период по облигациям 13-го и 14-го выпусков рассчитывается:

$$НКД = ((Н*П)/100)*(К365/365+К366/366),$$

где:

НКД – сумма накопленного процентного дохода (в валюте номинала).

Н – номинальная стоимость облигации.

П – процентная ставка по соответствующему процентному периоду, равная 8,5 % годовых.

К365 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней.

К366 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

День начала размещения процентных облигаций или день выплаты последнего процентного дохода и день расчета текущей стоимости процентных облигаций считаются одним днем.

**17. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.**

В случае запрета выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь эмитент не позднее 30 дней возвращает владельцам облигаций денежные средства с начислением процентов, рассчитанных из расчета:

16 процентов годовых – по облигациям 11-го выпуска;

действующей ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 4 процентных пункта – по облигациям 12-го выпуска;

8,5 процента годовых – по облигациям 13-го и 14-го выпусков.

**18. Дата и номер государственной регистрации облигаций.**

Облигации 11-го выпуска зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 19.03.2010.

Регистрационный номер 5-200-02-0516.

Облигации 12-го выпуска зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 19.03.2010.

Регистрационный номер 5-200-02-0517.

Облигации 13-го выпуска зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 19.03.2010.

Регистрационный номер 5-200-02-0518.

Облигации 14-го выпуска зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 19.03.2010.

Регистрационный номер 5-200-02-0519.

**19. Информация об обеспечении.**

Облигации 11-го, 12-го, 13-го и 14-го выпусков выпускаются по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» № 277. Общий размер обязательств по облигациям эмитента не превышает 80 процентов нормативного капитала эмитента. Выпуск облигаций согласован с Национальным банком Республики Беларусь, постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 03.03.2010 № 37.

Председатель правления В.Д. Бабарико

Главный бухгалтер Т.М. Пивовар

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 от 27.10.2006, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100429079.*

# РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА № 432
# АБ РОЎНЫХ ГАРАНТЫЯХ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВА ГРАМАДЗЯН НА АБАРОНУ АД БЕСПРАЦОЎЯ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., суддзяў Варановіча Т.В., Ізоткі У.П., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Сяргеевай В.Г., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П.

на падставе часткі восьмай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў

у парадку рэалізацыі права на ўнясенне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, у палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй прапаноў аб неабходнасці ўнясення ў акты заканадаўства змяненняў і (ці) дапаўненняў

разгледзеў у судовым пасяджэнні пытанне аб прававым рэгуляванні адносін, звязаных з назначэннем і выплатай грамадзянам, накіраваным на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі, стыпендый у залежнасці ад падстаў спынення працоўнага дагавора, а таксама з вызначэннем выпадкаў, пры якіх у назначэнні дапамогі па беспрацоўю можа быць адмоўлена.

Прааналізаваўшы палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Канстытуцыя), Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ПК), Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 года «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» (далей — Закон аб занятасці насельніцтва) і іншых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйны Суд устанавіў наступнае.

1. У адпаведнасці з артыкуламі 1 і 2 Канстытуцыі Рэспубліка Беларусь з'яўляецца прававой дзяржавай, у якой чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы.

Канстытуцыя, абвяшчаючы мэтай палітыкі Рэспублікі Беларусь як сацыяльнай дзяржавы яе адказнасць перад грамадзянінам за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы, права кожнага на годны ўзровень жыцця, уключаючы дастатковае харчаванне, адзенне, жыллё і пастаяннае паляпшэнне неабходных для гэтага ўмоў (частка першая артыкула 1, частка другая артыкула 2, частка другая артыкула 21), гарантуе грамадзянам Рэспублікі Беларусь права на працу як найбольш годны спосаб самасцвярджэння чалавека, а таксама на стварэнне ўмоў для поўнай занятасці насельніцтва (часткі першая і другая артыкула 41).

Па сэнсу ўказаных артыкулаў Канстытуцыі ў іх узаемасувязі з артыкулам 59 Канстытуцыі, згодна з якім дзяржава абавязана прымаць усе даступныя ёй меры для стварэння ўнутранага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, грамадзянам, якія часова страцілі работу і, такім чынам, гарантаваны заработак па не залежачых ад іх прычынах (у прыватнасці, з прычыны ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, скарачэння колькасці ці штата работнікаў, спынення працоўных адносін па некаторых іншых падставах), павінна быць прадастаўлена эфектыўная абарона, накіраваная на падтрыманне мінімальна неабходнага ўзроўню матэрыяльнага дастатку і на садзейнічанне ў працаўладкаванні.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што гарантыі, якія ўстанаўліваюцца заканадаўцам на падставе і ў адпаведнасці з канстытуцыйнымі палажэннямі аб абароне ад беспрацоўя, уключаючы права на навучанне новым спецыяльнасцям і павышэнне кваліфікацыі з улікам грамадскіх патрэбнасцей, а таксама на дапамогу па беспрацоўю, павінны быць заснаваны на ўніверсальных прынцыпах справядлівасці і роўнасці.

2. Абарона ад беспрацоўя забяспечваецца шляхам стварэння сістэмы мер садзейнічання занятасці і матэрыяльнай падтрымкі грамадзян, якія страцілі работу і прызнаны ва ўстаноўленым парадку беспрацоўнымі. Такая сістэма мер у цяперашні час прадугледжана Законам аб занятасці насельніцтва, які вызначае гарантыі дзяржавы па рэалізацыі канстытуцыйных правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь на працу і сацыяльную абарону ад беспрацоўя.

Згодна з артыкулам 10 Закона аб занятасці насельніцтва дзяржава ў галіне садзейнічання занятасці насельніцтва гарантуе беспрацоўным грамадзянам бясплатную прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі з улікам грамадскіх патрэбнасцей і ў адпаведнасці з наяўнымі схільнасцямі, здольнасцямі, навыкамі і асаблівасцямі іх псіхафізічнага развіцця, а таксама выплату дапамогі па беспрацоўю, стыпендыі ў перыяд навучання па накіраванню органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне (абзацы першы—трэці часткі чацвёртай).

У мэтах забеспячэння названых гарантый у якасці агульнага правіла ў артыкуле 23 Закона аб занятасці насельніцтва прадугледжана, што стыпендыі грамадзянам назначаюцца ў памеры 50 працэнтаў, а пры наяўнасці дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў ці дзіцяці-інваліда да 18 гадоў — 75 працэнтаў сярэдняй заработнай платы (даходу) па апошняму месцу работы, але не менш за паўтары велічыні мінімальнай дапамогі па беспрацоўю для дадзенага беспрацоўнага і не больш за трохразовую базавую велічыню (частка другая).

У той жа час у частцы трэцяй дадзенага артыкула ўстаноўлена, што грамадзянам, якія спынілі працоўны дагавор, заключаны на нявызначаны тэрмін, па ўласнаму жаданню, пагадненню бакоў, або працоўны дагавор з якімі спынены па падставах, прадугледжаных пунктамі 4, 5, 7—9 артыкула 42, пунктам 5 артыкула 44 і артыкулам 47 ПК, і якія зарэгістраваны ва ўстаноўленым парадку беспрацоўнымі, стыпендыя назначаецца ў памеры базавай велічыні. Канстытуцыйны Суд адзначае, што пры фармуляванні прыведзенай нормы заканадавец зыходзіў фактычна з абумоўленасці спынення працоўнага дагавора характарам дзеяння работніка (уласнае жаданне работніка, пагадненне бакоў або вінаватыя дзеянні работніка, якія з'яўляюцца прычынай звальнення па шэрагу пералічаных пунктаў артыкулаў 42, 44 і 47 ПК).

Разам з тым, паводле меркавання Канстытуцыйнага Суда, падыходы заканадаўца да выбару падстаў спынення працоўнага дагавора з работнікам, якія ўплываюць на памер выплаты стыпендый такім асобам, прызнаным ва ўстаноўленым парадку беспрацоўнымі, не з'яўляюцца паслядоўнымі і справядлівымі і ў канчатковым выніку не забяспечваюць гарантаванасць правоў асобных катэгорый грамадзян на сацыяльную абарону ад беспрацоўя, заснаваную на канстытуцыйных нормах і прынцыпах.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што няма дастатковых падстаў адносіць да грамадзян, на якіх распаўсюджваецца дзеянне часткі трэцяй артыкула 23 Закона аб занятасці насельніцтва, грамадзян, якія спынілі працоўныя адносіны па ўласнаму жаданню пры наяўнасці акалічнасцей, што выключаюць або значна абцяжарваюць прадаўжэнне работы (напрыклад, стан здароўя), а таксама ў выпадках парушэння наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага дагавора, пагаднення, працоўнага дагавора (частка чацвёртая артыкула 40 ПК), гэта значыць пры наяўнасці ўважлівых прычын. Такія прычыны ў выпадках, калі скасоўваецца тэрміновы працоўны дагавор (артыкул 41 ПК), прыняты заканадаўцам да ўвагі, у сувязі з чым звальненне па ўказанаму артыкулу не ўплывае ў наступным на памер выплаты стыпендыі, паколькі артыкул 41 ПК у пераліку падстаў спынення працоўнага дагавора, прыведзеным у артыкуле 23 Закона аб занятасці насельніцтва, адсутнічае.

Па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, ва ўдакладненні мае патрэбу таксама норма часткі трэцяй артыкула 23 Закона аб занятасці насельніцтва, у якой змяшчаецца спасылка на артыкул 47 ПК у цэлым, у сілу чаго дзеянне ўказанай нормы распаўсюджваецца на ўсіх работнікаў, працоўны дагавор з якімі спынены па ўсіх падставах, прадугледжаных дадзеным артыкулам ПК. Між тым у сувязі з дапаўненнем Законам Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2007 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь» артыкула 47 ПК пунктам 11 у цяперашні час па гэтаму пункту магчыма звальненне кіраўніка арганізацыі, яго намеснікаў, галоўнага бухгалтара ў сувязі са зменай уласніка маёмасці арганізацыі, гэта значыць фактычна пры адсутнасці віны ўказаных работнікаў.

3. Выкладзеная вышэй ацэнка Канстытуцыйным Судом заканадаўчых палажэнняў адносна памеру стыпендый, якія прызначаны і выплачваюцца грамадзянам, накіраваным на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі, у залежнасці ад падстаў спынення з імі працоўнага дагавора прымяняльная і да норм, замацаваных у артыкуле 24 Закона аб занятасці насельніцтва. У гэтым артыкуле ўстаноўлена агульнае правіла аб тым, што дапамога па беспрацоўю назначаецца органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і што дадзеная дапамога выплачваецца грамадзяніну з дня рэгістрацыі ва ўказаных органах у якасці беспрацоўнага, а таксама вызначаюцца асаблівасці выплаты дапамогі асобным катэгорыям беспрацоўных, парадак і ўмовы выплаты такой дапамогі. У той жа час згодна з абзацам другім часткі другой артыкула 24 у назначэнні дапамогі па беспрацоўю можа быць адмоўлена ў выпадку спынення працоўнага дагавора, заключанага на нявызначаны тэрмін, па ўласнаму жаданню, па пагадненню бакоў або спынення працоўнага дагавора па падставах, прадугледжаных пунктамі 4, 5, 7—9 артыкула 42, пунктам 5 артыкула 44 і артыкулам 47 ПК, а таксама звальнення (адлічэння) за парушэнне воінскай (навучальнай) дысцыпліны, страты (адсутнасці) крыніцы даходу ў выніку незаконных дзеянняў.

Канстытуцыйны Суд мяркуе, што, зыходзячы з сацыяльнага прадвызначэння дапамогі па беспрацоўю і накіраванасці дзяржаўных гарантый на належнае забеспячэнне канстытуцыйнага права грамадзян на абарону ад беспрацоўя, у назначэнні ўказанай дапамогі не можа быць адмоўлена грамадзянам, якія знаходзіліся ў працоўных адносінах на аснове працоўнага дагавора, заключанага на нявызначаны тэрмін, калі мела месца спыненне такога дагавора па жаданню работніка пры наяўнасці ўважлівых прычын (частка чацвёртая артыкула 40 ПК).

Выклікае сумненне абгрунтаванасць заканадаўчага палажэння аб тым, што можа быць адмоўлена ў назначэнні дапамогі па беспрацоўю асобам, на якіх распаўсюджваецца дзеянне пункта 11 артыкула 47 ПК, паколькі звальненне такіх асоб не абумоўлена іх вінаватымі дзеяннямі. Такім чынам, яны не могуць быць аднесены да грамадзян, на якіх распаўсюджваецца дзеянне абзаца другога часткі другой артыкула 24 Закона аб занятасці насельніцтва, працоўны дагавор з якімі спынены па падставах, што могуць выклікаць адмову ў назначэнні дапамогі па беспрацоўю.

4. Канстытуцыйнае палажэнне аб роўнасці ўсіх перад законам (артыкул 22 Канстытуцыі) з'яўляецца адным з фундаментальных пачаткаў прававой дзяржавы, узаемаадносін дзяржавы з чалавекам і грамадзянінам, асновай характарыстыкі канстытуцыйнага статусу асобы. Указаны прынцып распаўсюджваецца на ўсю сістэму права, што ў сілу асаблівасцей сфер прававога рэгулявання падразумявае не толькі магчымасць, але і неабходнасць замацавання ў асобных галінах заканадаўства спецыяльных механізмаў яго рэалізацыі.

Прынцып роўнасці ўсіх перад законам характарызуе прававое становішча грамадзян ва ўсіх галінах жыцця грамадства, уключаючы сацыяльную. У гэтай сферы ў Рэспубліцы Беларусь як сацыяльнай дзяржаве першаступеннае значэнне набывае канстытуцыйнае патрабаванне захавання роўнасці гарантый рэалізацыі сацыяльных правоў, замацаваных у Канстытуцыі і законах. Пры гэтым Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу на тое, што з улікам палажэнняў артыкулаў 22 і 23 Канстытуцыі прынцып роўнасці ўсіх перад законам не выключае канстытуцыйна абгрунтаванай дыферэнцыяцыі прававога рэгулявання, якая мае на мэце ўстанавіць прававыя адрозненні, перавагі і прывілеі для асобных катэгорый грамадзян (непаўналетніх, інвалідаў і да т.п.) з улікам неабходнасці захавання балансу канстытуцыйных каштоўнасцей і мэт, пры ўмове, што выкарыстоўваемыя для дасягнення гэтага прававыя сродкі з'яўляюцца разумнымі і суразмернымі абараняемым каштоўнасцям і мэтам.

Такім чынам, Канстытуцыйны Суд лічыць, што заканадаўчае рэгуляванне ў частцы вызначэння падстаў спынення працоўнага дагавора, якія ўплываюць на памер стыпендый, а таксама на магчымасць назначэння дапамогі па беспрацоўю, мае патрэбу ва ўдакладненні, паколькі грамадзянам, якія адносяцца да адной і той жа катэгорыі (звольненым з работы па прычынах, не звязаных з учыненнем імі вінаватых дзеянняў, і прызнаным беспрацоўнымі), не забяспечваецца роўная абарона ад беспрацоўя, што не адпавядае прынцыпам роўнасці і справядлівасці.

На падставе выкладзенага, кіруючыся часткай першай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкуламі 22 і 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь

**ВЫРАШЫЎ:**

1. У мэтах паслядоўнай рэалізацыі канстытуцыйнага прынцыпу роўнасці ўсіх перад законам, заканадаўчага замацавання магчымасцей рэалізацыі права кожнага на абарону ад беспрацоўя прызнаць неабходным у адпаведнасці з гэтым рашэннем унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» змяненні і дапаўненні, якія датычацца ўдакладнення:

у частцы трэцяй артыкула 23 — пераліку падстаў спынення працоўнага дагавора, з прычыны якіх стыпендыя беспрацоўным назначаецца ў меншым памеры ў параўнанні з агульнапрынятым;

у абзацы другім часткі другой артыкула 24 — пераліку падстаў спынення працоўнага дагавора, з прычыны якіх беспрацоўным можа быць адмоўлена ў назначэнні дапамогі па беспрацоўю.

2. Прапанаваць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь падрыхтаваць праект адпаведнага закона і ўнесці яго ва ўстаноўленым парадку ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

3. Гэта рашэнне ўступае ў сілу з дня прыняцця.

4. Апублікаваць гэта рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Старшынствуючы —**
**Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь** **П.П. МІКЛАШЭВІЧ**

*23 сакавіка 2010 г., г. Мінск*
*№ Р-432/2010*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
### по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| **Лот № 1.** **Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке** | Незавершенное законсервированное капитальное строение инв. № 401/U-14647, расположенное по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, дер. Суховляны, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 422088515601000014 площадью 0,8743 га сроком на 50 лет |
| **Начальная цена предмета аукциона – 133 368 486 руб., сумма задатка – 13 336 000 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества:** Государственное лесохозяйственное учреждение «Скидельский лесхоз», контактные телефоны: (8 0152) 97 52 51, 97 50 63 | |
| **Сведения об объектах недвижимости:** незавершенное строительством законсервированное капитальное строение – трехэтажное административно-бытовое здание с подвалом, общ. пл. 371,6 кв. м, фундамент бетонный, поверх него выполнено 2 ряда кирпичной кладки и гидроизоляция; наружные стены, внутренние капитальные стены и перегородки бревенчатые с разделкой швов между бревнами мхом, перекрытия деревянные, кровля двухскатная, металлическая; наружные инженерные сети не смонтированы; ограждение из железобетонных плит, установленных на фундаменте из бетонных подушек, высота 2,18 м, длина 215,6 п. м; начало строительства 1993 г., окончание – 1995 г., степень готовности 63,54% | |
| **Условия использования недвижимого имущества:** вовлечение в хозяйственный оборот в течение трех лет с момента подписания договора купли-продажи | |
| **Условия использования земельного участка:** осуществление в течение двух месяцев со дня принятии решения райисполкома о предоставлении покупателю земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; **ограничения по использованию:** водоохранная зона на пл. 0,8743 га, охранная зона линии электропередач напряжением свыше 1000 вольт на пл. 0,2061 га, охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 вольт на пл. 0,0739 га | |
| **Лот № 2.** **Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке** | Капитальные строения, расположенные по адресу: инв. № 411/С-12246 – Гродненская обл., Берестовицкий р-н, дер. Лесная, д. 32, инв. № 411/С-12247 – дер. Лесная, д. 9, инв. № 411/С-13255 – дер. Лесная, д. 32а, и право заключения договора аренды трех земельных участков с кадастровыми номерами 420484003801000012, 420484003801000013, 420484003801000014 общей площадью 0,109 га сроком на 50 лет |
| **Начальная цена предмета аукциона – 545 480 036 руб., сумма задатка – 54 548 000 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества:** Учреждение «Гродненское областное управление Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь», контактный телефон: (8 0152) 48 14 71 | |
| **Сведения об объектах недвижимости:** инв. № 411/С-122466 – одноэтажное кирпичное здание пожарного депо 1962 г. п., общ. пл. 301,1 кв. м; тепловые, водопроводные и канализационные сети; площадка из булыжника пл.38,9 кв. м; инв. № 411/С-12247 – одноэтажное кирпичное здание гаража 1960 г. п., общ. пл. 256,9 кв. м; тепловые сети, две площадки общ. пл. 107,5 кв. м; инв. № 411/С-13255 – площадка ЕТО (бутобетон монолит) 1972 г. п., пл. 24,9 кв. м | |
| **Условия использования недвижимого имущества:** вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента подписания договора купли-продажи | |
| **Условия использования земельного участка, ограничения по использованию:** осуществление в двухмесячный срок со дня принятия решения райисполкома о предоставлении покупателю земельных участков государственной регистрации прав на земельные участки; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ в случае изменения функционального назначения объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | |
| **Организатор аукциона:** Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней) | |

1. Аукцион состоится **6 мая 2010 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **по 30 апреля 2010 года до 16.00** по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

**К заявлению прилагаются следующие документы:**

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549;

- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия. Представителям юридических лиц просьба иметь при себе учредительные документы.

4. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения; имеет право снять предмет аукциона с аукциона в любое время до объявления его проданным.

6. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой, объявленной аукционистом цене, аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

7. Аукцион по конкретному предмету торгов признается нерезультативным, если в результате торгов данный объект не был продан в порядке, установленном законодательством, кому-либо из участников торгов. Аукцион по конкретному предмету торгов признается несостоявшимся, если торги не состоялись в связи с отсутствием участников торгов либо наличием только одного участника.

8. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (далее – претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

9. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

10. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

11. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

12. В случае невыполнения условий продажи объекта приобретателем имущества договор купли-продажи расторгается в одностороннем порядке в соответствии с действующим законодательством без компенсации расходов.

# Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 10 (342)

## КУТОК ДЛЯ АДПАЧЫНКУ

Калі вы марыце стварыць на сваім участку куточак для адпачынку і пры гэтым з карысцю і рацыянальна выкарыстаць яго плошчу, у якасці дэкаратыўных раслін можна пасадзіць барбарыс, аронію, глог, грэцкі арэх, актынідыю. Калі вы правільна выбераце для іх месца, вы зможаце абараніць свой участак ад ветру, чужых вачэй, стварыць фон для кветніка.

Успомніце, як у садзе вясной ідзе чароўны водар ад кветак бэзу, нібы нявеста ў белай квецені стаіць каліна, а ўвосень на ёй палымнеюць гронкі ягад. Прыгожа будуць выглядаць кусты з незвычайнымі пладамі: белымі — у снежнаягадніка, ярка-чырвонымі і сіне-чорнымі — у барбарыса.



Калі вы хочаце азеляніць сцяну дома ці схаваць хібы агароджы — тады можаце высадзіць дзявочы (дзікі) вінаград. Разрастаючыся, ён закрые густым дыванам усю адведзеную для яго плошчу. А ўвосень яго лісты будуць пераліваццa жоўта-чырвоным колерам, і цяжка будзе адарваць позірк ад гэтай прыгажосці.

З ліян варта звярнуць увагу на актынідыю. Галоўная яе заслуга — стракатасць лістоў. Гэта даволі рэдкая з'ява сярод ліян. У чэрвені частка лістоў набывае светла-ружовую афарбоўку, якая пераходзіць у малінавую, якая з цягам часу змяняецца зялёнай. А вось другая ліяна — лімоннік — не толькі вызначаецца дэкаратыўнымі гронкамі ярка-чырвоных ягад, але і напаўняе навакольнае асяроддзе прыемным асвяжальным пахам лімона.

Для тых, у каго ёсць на ўчастку лазня, будзе дарэчы пасадзіць грэцкі арэх. З цягам часу, калі арэх будзе пладаносіць, ён выканае сваю асноўную функцыю, а да гэтага яго лісты, якія валодаюць бактэрыцыднымі ўласцівасцямі, можна будзе выкарыстаць у лазні. Венік са свежых або высушаных лістоў грэцкага арэха дапаможа пры рэўматычным болі і іншых запаленчых працэсах у суставах, пры экзэме, алергіі, псарыязе, акажа танізуючае, агульнаўмацавальнае, сасударасшыральнае ўздзеянне. Апалосканне валасоў настоем лістоў надасць ім каштанавы бляск.

## ГАРОХ — ЗАМЕННІК МЯСА

Па колькасці вугляводаў і бялкоў гарох і іншыя бабовыя прыраўноўваюць да мяса. Звычайная зялёная гарошына — гэта таблетка цэлай групы вітамінаў. Разам з гарохам вы атрымліваеце патрэбны арганізму запас соляў жалеза, калію, кальцыю, фосфару. Салодкі смак гароху надаюць глюкоза і фруктоза, якія ўтрымліваюцца ў пладах.

Высяваюць гарох рана, адразу, як толькі падсохне глеба. Участак адводзяць урадлівы і, галоўнае, сонечны. Норма высеву прыблізна 80—120 гарошын на 1 кв. м. Нізкаспрослыя гатункі сеюць гусцей, тыя, што ўюцца, наадварот. Загортваюць насенне на глыбіню 4-7 см, у залежнасці ад глебы. На лёгкіх пясчаных глебах насенне загортваецца глыбей, на гліністых і сырых — бліжэй да паверхні.

Усходы з'яўляюцца на 15-ы дзень пасля высявання. Найлепшыя папярэднікі гароху — гарбузы, агуркі, капуста і бульба. Угнаенні, фосфарныя і калійныя, уносяць пад папярэднікі ці ўвосень, тады плады будуць больш мяккімі і смачнымі. На свежаўгноеным участку ў гароху вырастае высокае бацвінне і мала стручкоў. Догляд гароху зводзіцца да праполкі, а ў засуху — да паліву.

Адна з самых злосных ворагаў гароху — гарохавая пладажэрка, ці ліставёртка. Змагацца з гарохавай пладажэркай дапамагае перыядычнае апырскванне раслін адварамі палыну горкага, таматнага бацвіння, настоямі каранёў лопуху, лістоў чыстацелу, тытуню і часнаку.

Настой часнаку дапамагае і ад гарохавай тлі. Дапамагае ў барацьбе з пладажэркай і пудраванне раслін попелам, тытунём, сухім парашком чыстацелу. Эфектыўнымі сродкамі аховы ад пладажэркі з'яўляюцца падзімняя перакопка і ранняе высяванне.

І яшчэ адзін шкоднік наносіць шкоду пасеяным гарошынам — гарохавая зярноўка. Часта прычынай таго, што расліна не ўзышла, бывае менавіта гэты шкоднік. У адрозненне ад гарохавай пладажэркі, якая псуе гарошыны ўсярэдзіне стручка, гэтага шкодніка цяжка выявіць. Жукі новага пакалення зімуюць у гарошынах, а вясной іх высяваюць разам са шкоднікам. Часам яны выходзяць з гарошын і зімуюць у складскіх памяшканнях ці пад апалым лісцем. Як жа змагацца з гэтым злосным ворагам? **Спецыялісты раяць апрацоўваць ядахімікатамі — бромістым металам. Але гэта небяспечная працэдура, яна праводзіцца толькі спецыялістамі!!!**

У перыяд вегетацыі рэкамендуецца апырскаць 50-працэнтным растворам гексахларану з разліку 0,5 кг/га. Зноў жа, пасля такой апрацоўкі забараняецца выкарыстоўваць зялёны гарошак для кансервавання, зялёную масу на корм жывёле і на сілас — не менш чым на працягу 60 дзён.

Вельмі распаўсюджаная хвароба гароху — мучністая раса. З ёй можна справіцца з дапамогай настою асоту: 300 грамаў лісця настойваюць у вядры 8 гадзін. Апырскванне праводзіцца двойчы, з інтэрвалам у тыдзень.

**НЕКАЛЬКІ КАРЫСНЫХ ПАРАД:**

сухі гарох набрыньвае за 4-5 гадзін. Варыць яго ў той жа вадзе, у якой ён намакаў;

гарох соляць у канцы варкі;

свежазамарожаны зялёны гарошак кідайце ў круты вар не размарожваючы. У такім выглядзе ён будзе больш смачны і вітамінаў захаваецца больш.

## ПАДКАЗКА ЗА АКНОМ

Вясна для агароднікаў — час клопатны. Самае складанае для агароднікаў, а тым больш для навічкоў, — правільна выбраць час сяўбы той ці іншай культуры. У літаратуры адны культуры рэкамендуюць сеяць, калі глеба прагрэецца да 5 градусаў, іншыя — пры тэмпературы 10—15 градусаў. Але ж не будзеш пастаянна бегаць на ўчастак з тэрмометрам. Можна арыентавацца на народныя (царкоўныя) святы. Напрыклад, гуркі раяць высяваць на Міколу (22 мая) і Пахома (28 мая), на Міколу, кажуць, варта садзіць сямейную цыбулю, бульбу і г.д. Аднак розных мясцовасцяў па-рознаму: калі на поўдні ўжо пасеялі і забылі, то ў паўночных раёнах такімі работамі займацца яшчэ рана. І ўсё ж дакладную падказку, кажуць нашы чытачы, можна знайсці за акном.

Моркву, радыску, цыбулю чарнушку і цыбулю-сеянку, гарох, яравы часнок прынята садзіць, калі пачынаюць зелянець лугі, а ў чаромхі раскрываецца першы ліст. Масавая сяўба бручкі, бабовых культур і сталовых буракоў прыпадае на цвіценне лотаці (калужніцы), ці калі зазелянеюць бярозы. А вось калі ў вашай мясцовасці разгарнула ліст асіна ці зацвіла чаромха — час садзіць бульбу, «сямейную» цыбулю і расаду ранняй белакачаннай капусты. Гэтыя культуры, а таксама сярэдняспелую капусту можна садзіць, пакуль не зацвіце шыпшына. Больш позднія пасадкі даюць меншы ўраджай.

Таматы, перцы, кабачкі, цеплалюбівыя агуркі можна пераносіць у адкрыты грунт, калі міне пагроза замаразкаў. Каб зменшыць гібель раслін ад замаразкаў, прыгледзьцеся да вольхі шэрай, да рабіны. Не спяшаюцца яны зацвітаць — не спяшайцеся і вы высаджваць расаду ў адкрыты грунт.

Паназірайце за прыродай — і расліны-індыкатары вам падкажуць лепшыя тэрміны сяўбы ці пасадкі агародніны.

## Такія вось ахоўнікі!

Супрацоўнікі Драгічынскага РАУС на двары ў егера мясцовага таварыства паляўнічых і рыбаловаў знайшлі астанкі некалькіх тушаў дзікоў. Больш пільны агляд будынкаў і дома егера выявіў дзве галавы дзікоў, а ў халадзільніку — 2 замарожаныя языкі. Гаспадар растлумачыў, што галовы звяроў для чучала прынёс знаёмы. Дзікі, быццам бы, утапіліся ў Дняпроўска-Бугскім канале. Вядзецца праверка.

А ў Пінскім раёне на вадасховішчы «Пагост» інспектары затрымалі рыбавода ААТ «Рыбгас «Палессе», які са знаёмым з дапамогай сетак здабыў 16 шчупакоў, і гэта тады, калі іх лоўля забаронена. Заведзена крымінальная справа.

## Без амфетаміну і маёмасці

Увагу пінскіх супрацоўнікаў аддзела наркакантролю прыцягнула група збытчыкаў амфетаміну. Аператыўнікам удалося затрымаць трох жыхароў горада, якія займаліся збытам наркотыку. Падчас вобыску ў затрыманых і тых, хто купляў амфетамін, знайшлі 103,5 грама гэтага рэчыва. Высветлілася, што наркотык пастаўляў 42-гадовы жыхар Пінска, які ўжо з лістапада 2009 года купляў амфетамін у Пскове і перавозіў у тайніках сваёй аўтамашыны праз беларуска-расійскую мяжу. На маёмасць затрыманых накладзены арышт і заведзена крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА
### Адзін повар паклаў у ложак больш як 100 чалавек

Як паведамляла раней «Звязда», у перыяд з 20 па 23 сакавіка ў пінскім дзіцячым садку № 29 адбылася ўспышка вострых кішэчных інфекцый. Ахвярамі невядомай кішэчнай інфекцый сталі 99 дзяцей і 4 дарослыя. Пазней у 59 захварэлых дзяцей быў лабараторна пацверджаны дыягназ «сальманелёз». Цяжкіх выпадкаў захворвання зарэгістравана не было, зафіксаваныя больш лёгкая і сярэдняя форма цяжкасці. Цяпер большасць пацыентаў ужо выпісаліся са стацыянара.

Як паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя, у ходзе эпідэміялагічнага расследавання было ўстаноўлена, што крыніцай інфекцыі стаў повар дзіцячага сада, які аказаўся вострым бактэрыяносьбітам сальманелы. Інфекцыя распаўсюдзілася харчовым шляхам. Зараз супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы па лакалізацыі ачага працягваюцца. Па краіне праводзіцца работа па папярэджванні аналагічных выпадкаў узнікнення ўспышачнага захворвання вострымі кішэчнымі інфекцыямі ў дзіцячых арганізаваных калектывах, у арганізацыях аховы здароўя, на харчовых прадпрыемствах і прадпрыемствах гандлю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## І «ПАЦІСНУЦЬ МЯДЗВЕДЗЮ ЛАПУ»...

**УСЛЕД за аматарамі сакалінага палявання ў беларускіх лясах, а таксама ахвотнымі паляваць ва ўгоддзях з арбалетамі і лукамі, са сваімі прапановамі па змяненні дзейных правілаў палявання выступіла група біялагічных экстрэмалаў.**



Яны прапанавалі аднавіць старажытны від палявання на мядзведзя з рагацінай. Аднак, улічваючы, што, па-першае, гэтая жывёла ўнесеная ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, а значыць, ахоўваецца дзяржавай, па-другое, сама папуляцыя мядзведзя ў нашай краіне, на жаль, зусім малая, яны настойваюць на такім выйсці са становішча, якое можа цалкам усіх задаволіць. Прыгадаўшы яшчэ больш раннюю забаву нашых продкаў, яны прапануюць дазволіць «выходзіць на мядзведзя» ўвогуле з голымі рукамі. Сустрэўшы ў лесе дзікага звера, такі паляўнічы за «шкурай незабітага мядзведзя» павінен спрытна схапіць рукамі абедзве пярэднія лапы дзічыны і трымаць іх да той пары, пакуль па вонкавых прыкметах не стане зразумелым, што звер скарыўся і гатовы адступіць. Менавіта з-за апошняй акалічнасці ініцыятары палявання на мядзведзяў катэгарычна настойваюць: дазвол можна будзе выдаваць толькі біялагічным экстрэмалам, што маюць адпаведную адукацыю. Яны, у сваю чаргу, абяцаюць, што ніводны касалапы ў краіне не пацерпіць.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**


УНП 100120218.

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ
## ОАО «МОНТАЖЛЕГМАШ» за 2009 год
### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| Наименование статей | Сумма, млн руб | Наименование статей | Сумма, млн руб |
| Внеоборотные активы | 3198 | Капитал и резервы | 8013 |
| Оборотные активы | 8605 | Обязательства | 3790 |
| **БАЛАНС** | **11803** | | **11803** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2009 год

| Наименование показателей | единица изм. | Сумма |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, работ, услуг | млн руб. | 26977 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | млн руб. | 4174 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг, управленческие расходы | млн. руб. | 15105 |
| Сальдо по операционным доходам и расходам | млн руб. | 12 |
| Сальдо внереализационных доходов и расходов | млн руб. | 130 |
| Налоги и другие расходы и платежи из прибыли | млн руб. | 963 |
| Чистая прибыль (убыток) | млн руб. | 3700 |
| Количество акционеров, в т.ч. | лиц | 115 |
| юридических лиц | лиц | 0 |
| физических лиц | лиц | 115 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 1652 |
| Кол-во акций, находящихся на балансе | штук | 0 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 199 |

